**Тамара Габрусь**

# Драўляныя храмы Верхняга Падзвіння і Падняпроўя XVI–XVII ст.

**Tamara Gabrus**

**Wooden Churches of the Upper Padivinnia and the Dnieper region in 16th–17th century**

There was not any wooden church from the period between 16th and 17th centuries preserved in its authentic state in Belarus. The principal sources about the national architectural traditions of that time are graphic archival materials and some researches from 17th to 20th centuries. In the article we analyze an architectural typology of a number of Belarusian wooden churches from 16th and 17th c. in the region of Upper Dnieper and Dvina.

*Keywords:* Belarusian wooden architecture, Vitebsk’s sketches, cross-shaped churches, architectonics, Baroque features

**Дерев’яні храми Верхнього Подзвіння і Подніпров’я XVI–XVII ст.**

Присвячено архітектурно-типологічному і стилістичному аналізу дерев’яних храмів Верхнього Подзвіння і Подніпров’я кінця XVI–XVII ст. за «Кресленнями міста Вітебська» 1664 р. й інших архівних джерел.

*Ключові слова:* білоруська дерев’яна архітектура, креслення міста Вітебська, хрестоподібні храми, архітектоніка, риси бароко

У наш час у Беларусі не ацалела ніводнага аўтэнтычнага драўлянага храма XVI ст., таму асноўнымі крыніцамі для вывучэння даўнейшых архітэктурна-будаўнічых традыцый з’яўляюцца старажытныя архіўныя пісьмовыя і графічныя дакументы. Для гісторыі беларускага драўлянага дойлідства адной з каштоўнейшых крыніц з’яўляецца вядомы «Чарцёж места Віцебска» 1664 г., упершыню выдадзены А. П.Сапуновым у 1910 г. у «Трудах Витебской Архивной Комиссии»[1] і затым асобным адбіткам. Пазней «Чарцёж» грунтоўна даследаваўся В. Краснянскім, які адзначаў, што на ім «усе будынкі паданы не ў выглядзе планаў, але як перспектыўныя малюнкі. Праўда, гэтая перспектыва вельмі своеадметная, умоўная і часам неправільная; гэта, аднак, не перашкаджае таму, каб на іх падставе скласці сабе ўяўленне аб зарысаваных будынках»[2].

У 1654 г. Віцебск, найстаражытнейшы горад Беларусі, быў захоплены войскамі маскоўскага цара Аляксея Міхайлавіча і 13 гадоў знаходзіўся пад уладай Масквы. У гэты час амаль зруйнаваны горад быў часткова адбудаваны і 15 лістапада 1664 г. тагачасным віцебскім ваяводам Якавам Валконскім маскоўскаму цару дасланы азначаны «Чарцёж» з пасыльным Маркаю Быкавым. Каштарысныя кнігі Віцебска за 1655 і 1665–1666 гг. цалкам падцвярджаюць тапаграфічную дакладнасць «Чарцяжа». На ім прадстаўлены ўмацаванні Верхняга замка які ўключае ваяводскі двор, астрог, двор Горскага і Міхайлаўскую царкву XVII ст.; Ніжні замак, дзе знаходзілася старажытная мураваная Дабравешчанская царква XII ст., двор Агінскіх і драўляны саборак званага Аляксееўскага манастыра; Верхні горад, на тэрыторыі якога знаходзіліся ратуша, гасцінны двор, Васкрасенская, Увядзенская, Сямёнаўская і Спаса-Праабражэнская цэрквы; Святадухаўская царква ў Заручаўскай слабадзе. За выключэннем Дабравешчанскай царквы ўсе пабудовы былі драўляныя (іл. 1).

В. Краснянскі адзначаў, што «знаёмства з архітэктурнымі асаблівасцямі віцебскіх цытадэльных пабудоў, зарысаваных на «Чарцяжы» 1664 г., [...] прыводзіць нас да пераканання, што яны не маюць у сабе слядоў маскоўскага ўплыву і з’яўляюцца помнікамі чыста беларускага будаўніцтва. Яны будаваліся выключна віцебскімі цеслямі, а таксама «витебскими всяких чинов людьми» (з адказу ваяводы Рэпніна смаленскаму ваяводзе на просьбу аб прысылцы майстроў з Віцебска ў Смаленск). Гэта падцвярджаецца і будаўнічай тэрміналогіяй складзеных маскоўцамі тагачасных Каштарысных кніг: «башня рублена клецки, по-шатровому, роговая башня, тропило шестеричное, ганок, круглик, рухомая стена, фортка, подчени, городня, надолба»[3].

Усе драўляныя праваслаўныя цэрквы, адлюстраваныя на чарцяжы Віцебска 1664 г. (за выключэннем Сямёнаўскай і сабора так званага Аляксееўскага манастыра – былога касцёла езуітаў) былі пабудаваныя ў XVI ст. У інвентары Полацкага архіепіскапства за 1618 г. яны упамінаюцца як даўно існуючыя[4]. Такім чынам па гэтых выявах мы можам меркаваць пра наяўнасць ужо на мяжы XVI–XVII ст. тых ці іншых архітэктурных формаў, улацівых тагачаснаму беларускаму драўлянаму сакральнаму дойлідству. Цікава, што на «Чарцяжы» іх падоўжна-восевая структура падаецца нібыта ў «разгорнутым» выглядзе, з элементамі аксанаметрыі.

Сярод віцебскіх драўляных храмаў можна вылучыць некалькі варыянтаў архітэктанічных кампазіцый. Прасцейшую з іх прадстаўляе




*Ілюстрацыі паводле Чарцяжа Віцебска 1664 г.*
*1 – Васкрасенская царква; 2 – Касцёл езуітаў ці Аляксееўскі манастыр; 3 – Спаса-Праабражэнская царква; 4 – Сямёнаўская царква; 5 – Міхайлаўская царква; 6 – Увядзенская царква; 7 – Ратуша; 8 – Троіцкі сабор Маркава манастыра ў Віцебску. Малюнак Д.Струкава 1864 г.*

Міхайлаўская царква, якая складалася з двух зрубаў: асноўнага і алтарнага, накрытых асобнымі двухсхільнымі дахамі на «латах» (адпаведна: рус. слегах, укр. сломенах). Ад жылых дамоў, прадстаўленых на тым жа чарцяжы, яе вылучае наяўнасць галоўкі з крыжам у цэнтры вільчыка. Прымітыўнасць пабудовы сведчыць пра яе часовасць, тым больш, што заснаванне ў Віцебску мураванай царквы ў гонар Архангела Міхаіла летапісы адносяць да часоў княгіні Вольгі. Паводле А.Семянтоўскага, будаўніцтва мураванай царквы на гэтым месцы адбылося ў 1320 г. (спалена ў 1396 г.)[5]. Падобную кампазіцыю атрымала і Сямёнаўская царква, пабудаваная ў другой чвэрці XVII ст., што сведчыць пра традыцыйнасць і пазачасавасць гэтага архаічнага тыпа храма.

Другі варыянт архітэктанічнай кампазіцыі прадстаўляюць Увядзенская і Васкрасенская цэрквы. Яны абедзве складаліся з двух (асноўнага і алтарнага) зрубаў, з самастойным верхам кожнага зруба. У абодвух выпадках аснову кампазіцыі складае высокі квадратны ў плане зруб, абкружаны з трох бакоў невысокай закрытай галярэяй-апасанню (назва паходзіць ад слова «пасак» ці пояс). В. Краснянскі ў сваіх доследах канстатуе «адсутнасць у адлюстраваных на чарцяжы храмах адкрытых надворных галерэй, характэрных для беларускага дойлідства». Падобная цэнтрычна-ярусная кампазіцыя асноўнага аб’ёма з закрытай апасанню назіраецца на Віцебшчыне і ў далейшым, напрыклад, у цэрквах у Баранi і Смалянах Аршанскага р-на другой паловы XVIII ст.

У розных рэгіёнах Беларусі адкрытыя абхадныя галерэі зваліся «апасанямі» ці «падчэнямі». Падобныя галерэі характэрныя ў XVII ст. і для цэркваў Галіччыны бойкаўскага тыпу, дзе яны зваліся «опасання» ці «підсябітка», і для шэрагу цэркваў Маскоўскай Русі, дзе мелі назву «гульбішча»[6]. Галерэі-апасані рабіліся для прытулку вернікаў і аховы падвалін ад атмасферных ападкаў. На наш погляд, закрытыя галерэі, што абкружаюць асноўныя зрубы храмаў рэгіёна Верхняга Падзвіння і Падняпроўя, больш адпавядаюць тутэйшаму клімату, больш суровым параўнальна з украінскім.

Званіцы Васкрасенскай і Увядзенскай цэркваў далучаліся да паўночна-заходняга вугла асноўных зруба, але не служылі бабінцамі храмаў. Званіца Ўвядзенскай царквы нагадвала абарончую вежу з навісаючым верхам-»абламам», падобную да драўляных умацаванняў віцебскіх замкаў. Званіца Васкрасенскай царквы мела даволі незвычайную структуру з вонкавай лесвіцай, што вяла на другі ярус. Усе часткі гэтых

храмаў былі накрыты невысокімі шатрамі-«каўпакамі», традыцыйнымі для мясцовага драўлянага крапаснога дойлідства.

Трэці варыянт аб’ёіна-прасторавай кампазіцыі драўляных храмаў Віцебска на «Чарцяжы» прадстаўляе трохзрубавая Спаса-Праабражэнская царква пачатку XVII ст., якая складалася з квадратнага асноўнага зруба, накрытага двухсхільным дахам, пяціграннага алтарнага зруба і трох’яруснай вежы-званіцы з бабінцам у ніжнім ярусе. Вышыня зрубаў значна перавышала параметры іх планаў, што надавала кампазіцыі збудавання выразны вертыкалізм і дынаміку, якая ўзрастала ад алтара да галоўнага фасада. Гэтая дынаміка падкрэслена дадаткова увагнута-пукатымі купаламі-«банямі» на вільчыку даха асноўнага зруба і над званіцай. Архітэктоніка Спасаўскай царквы па сутнасці паўтарала тагачасныя мураваныя готыка-рэнесансныя храмы Беларусі. Між тым, расійскі акадэмік архітэктуры А. Паўлінаў у сваім вядомым даследаванні памылкова вызначае Спаса-Праабражэнскую царкву як храм крыжовага тыпу[7]. Змястоўны інвентар Спаса-Праабражэнскай царквы (1785 г.) апублікаваны ў «Памятной книжке Витебской губернии» за 1865 г., але ў хуткім часе пасля гэтага яна згарэла[8].

Найбольш складаныя аб’ёмна-прасторавыя кампазіцыі і рознабаковы генезіс архітэктурных форм мелі саборная царква «Аляксееўскага» манастыра і заручаўская «кажамяцкая» царква Святога Духа.

Драўляны сабор «Аляксееўскага» манастыра пабудаваны ў 1640 г. як касцёл ордэна езуітаў на месцы старажытнай праваслаўнай Пятніцкай царквы. У 1655 г. храм перадалі праваслаўным і асвяцілі ў гонар св. Аляксея, нябеснага патрона маскоўскага цара. Будынак сабора складаўся з выцягнутага прамавугольнага асноўнага зруба і трох’яруснай вежай-бабінцам (васьмярык на двух чацверыках), увенчанай фігурнай банькай. Невялічкая званіца на слупах, завершаная шатром, пастаўлена асобна на паўднёвы-захад ад храма. Значныя памеры асноўнага зруба сведчаць пра тое, што тут быў выкарыстаны ўжо заходнееўрапейскі метад зрошчвання бярвенняў у адной плоскасці. Характар алтарнай часткі паводле чарцяжа не высветлены, аднак два сіметрычныя бакавыя прырубы каля алтара нагадваюць рамёны трансепта і фарміруюць архітэктоніку храма ў выглядзе лацінскага крыжа. В. Краснянскі лічыў, што бакавыя прырубы зрабілі маскоўцы, каб надаць храму праваслаўную трохапсіднасць, але, на нашу думку, яны толькі змянілі іх пакрыццё на шатровае, з цыбулепадобнымі галоўкамі, а над уваходнай манастырскай

брамай узвялі груваздкі кубасты купал. У выяўленым намі інвентары 1704 г. гэты помнік «даўніх часоў», які зноў стаў касцёлам, вызначаецца як «крыжовы»[9]. Насамрэч, ён кампазіцыйна імітуе лацінскую крыжовую базіліку з невялікімі крыламі трансепта.

Крыжовы варыянт храма ранневізантыйскага генезісу (з планам у выглядзе роўнаканцовага грэчаскага крыжа) на той час у Віцебску прадстаўляла толькі царква Святога Духа, што знаходзілася ў Заручаўскай слабадзе. Яе заснаванне, паводле падання, адносіцца да XIV ст. і звязана з іменем Марыі Віцебскай, жонкі вялікага князя літоўскага Альгерда. Нягледзячы на ўмоўнасць яе выявы на чарцяжы Віцебска 1664 г., відавочна, што гэты праваслаўны храм складаўся з кубічнага асноўнага зруба, да якога па баках света далучаліся чатыры квадратныя ў плане прырубы. Усе зрубы завяршаліся пакатымі чатырохграннымі шатрамі з лёгкім выгінам і выцягнутымі свечкападобнымі галоўкамі з крыжамі на штыберах. Практычна тут была ўзноўлена раннехрысціянская пяцігаловая кампазіцыя вянчаючых мас па баках света, а не па дыяганалях плана кафалікона, характэрнае для артадаксальнага праваслаўя пра-маскоўскай арыентацыі.

Распаўсюджанне крыжовага чатырохзрубавага праваслаўнага храма, структура якога да ўзроўня карніза мела выгляд роўнаканцовага грэчаскага крыжа, а вышэй вячалася пяцігалоўем па баках свету, на пачатку XVII ст. мела праграмны ідэалагічны напрамак. Рух супраць насаджэння унія ў абарону праваслаўя на тэрыторыі этнічнай Белай Русі ўзначаліў падкаморы мсціслаўскі Багдан Сцяткевіч, які заснаваў шэраг праваслаўных манастыроў Магілёўскай епархіі, якія падпарадкоўваліся канстанцінопальскаму патрыярху. У 1623 г. ім заснаваны Богаяўленскі Куцеінскі мужчынскі манастыр пад Оршай, у 1631 г. там жа – Успенскі жаночы манастыр, у 1633 г. – Богаяўленскі брацкі сабор у Магілёве, у 1641 г. – Баркалабаўскі манастыр каля Старога Быхава, у 1643 г. – Буйніцкі манастыр каля Магілёва. Дзве апошнія фундацыі пазначаны таксама яго жонкаю Аленаю (з Саламарэцкіх).

Праваслаўнага веравызнання прытрымліваліся на той час многія іншыя буйныя магнаты і шляхта. Будаўніцтва саборнага храма Троіцкага Маркавага манастыра ў Віцебску пачалося ў 1633 г. па фундацыі князя Льва Самуіла Агінскага. У 1637 г. ён жа заснаваў полацкі Багаяўленскі манастыр з драўляным саборам. У 1641 г. багаты шляхціц Канстанцін Іпацій Маскевіч фундаваў драўляны сабор Святадухаўскага Тупічэўскага

манастыра пад Мсціславам[10]. Выкарыстанне таннага і недаўгавечнага будаўнічага матэрыялу было абумоўлена палітычным уціскам, што вымушала праваслаўнае насельніцтва дзяржавы вырашаць свае філасофска-рэлігійныя задачы больш простымі і даступнымі сродкамі. Пры будаўніцтве саборных храмаў найбольш значных праваслаўных манастыроў усходніх ваяводстваў Вялікага Княства Літоўскага: Полацкага, Віцебскага, Мсціслаўскага і Смаленскага стабільна ўжывадася чатырохзрубавая аб'ёмна-прасторавая кампазіцыя крыжовага тыпу з планам у выглядзе роўнаканцовага грэчаскага крыжа. Бясспрэчна, гэта рабілася цалкам свядома і праграмна, з мэтай падкрэсліць непасрэдную сувязь з візантыйска-грэчаскай традыцыяй. Але пры строгай кананічнасці азначанай архітэктанічнай схемы на працягу XVII – XVIII стст. з ёй адбыліся пэўныя змены на шляху выпрацоўкі адметных архітэктурных форм і прыёмаў беларускага драўлянага дойлідства часоў барока.

Найбольш раннія саборныя цэрквы Богаяўленскага Куцеінскага манастыра пад Оршай і Святадухаўскага Тупічэўскага манастыра пад Мсціславам складаліся з чатырох зрубаў роўнай вышыні, размешчаных папарна па ўзаемна перпендыкулярных восях, арыентаваных па баках свету. Заходні ўваходны зруб ставіўся прамавугольным, а ўсходні алтарны і бакавыя былі аднолькавыя, пяціграныя. Усе зрубы былі накрыты вальмавымі дахамі з галоўкамі ў месцы злучэння вальмаў, а прастора сяродкрыжжа ўвенчвалася светлавым васьміграннымі барабанам з купалам. Аб'ёмна-прасторавая кампазіцыя гэтых храмаў да ўзроўня карніза мела форму грэчаскага крыжа. Сімволіка будовы азначала прадстаянне перад Богам па праваслаўнаму візантыйскаму абраду і палымяную адданасць гэтай ідэі.

Ёсць падставы меркаваць, што аналагічную кампазіцыю атрымалі таксама саборныя цэрквы Баркалабаўскага і Буйніцкага манастыроў, заснаванымі тым жа Багданам Сцяткевічам. У фундушавым запісе на Святадухаўскі манастыр у Буйнічах фундатарам пазначана ўмова – заўжды падпаракоўвацца канстанцінопальскаму патрыярху.

У тым, што чатырохзрубавыя цэнтрычна-крыжовыя храмы з планам у выглядзе грэчаскага крыжа не былі выпадковымі, а ўвасаблялі пэўны сацыяльны заказ і ідэалагічную праграму, пераконвае далейшае развіццё іх форм у дойлідстве наступнай эпохі, аддзеленай ад папярэдняй руска-польска-шведскай вайной 1654–1667 гг. Яскравым прыкладам гэтага з'яўляецца Троіцкі сабор Маркава манастыра ў Віцебску, узвед-

зены на падмурку царквы, закладзенай у 1633 г. князем Л. С. Агінскім з жонкаю і знішчанай пажарам у другой палове XVII ст. Іх сын Сымон Караль Агінскі, мечнік Вялікага Княства Літоўскага, падкаморы віцебскі, быў ужо католікам, аднак ў 1687 г. падцвердзіў фунлуш на будаўніцтва сабора праваслаўнага манастыра. Пра гэта паведамлялі два надпісы над уваходам з двух бакоў, зробленыя лацінкай і кірыліцай: «Дом гэты збудаваны ў гонар Святой Тройцы. Року 1690, мая 8». Асвяцілі храм у 1691 г.

У адрозненне ад крыжовых храмаў першай паловы стагоддзя, якія мелі вальмавыя дахі з чатырма галоўкамі па баках свету і цэнтральнай на светлавым барабане сяродкрыжжа, у Троіцкім саборы Маркава манастыра ўсе зрубы і сяродкрыжжа завяршаліся асобнымі даволі высокімі шатрамі з галоўкамі. Такім чынам яго кампазіцыю трэба вызначаць ужо як пяціверхавую. Да таго ж, у беларускім драўляным дойлідстве традыцыйнай была форма больш пакатага шатра-«каўпака», з вышынёй, роўнай палове дыяганалі аснавання. Верх у выглядзе высокага шатра відавочна запазычаны з рускага дойлідства падчас акупацыі Віцебска маскоўскім войскам, што ўжо адзначалася на прыкладзе перабудовы віцебскага касцёла езуітаў у Аляксееўскі манастыр. Аднак у адрозненне ад рускіх драўляных цэркваў, дзе высокія шатры мелі бярвенчатую канструкцыю, а іх унутраная прастора не ўключалася ў агульны інтэр’ер храма, у Троіцкім саборы ўнутры шатроў кроквеннай канструкцыі былі зроблены васьмігранныя самкнутыя скляпенні на тромпах. Над сяродкрыжжам знаходзіўся светлавы барабан з купалком, схаваным ўнутры вась-мікантовай галоўкі (іл. 2).

Унутры сцены і скляпенні Троіцкага сабора Маркава манастыра цалкам пакрываў роспіс, зроблены ў параўнанні з вышэй разгледжанымі куцеінскім і тупічэўскім не клеевымі, а алейнымі фарбамі на палат-



*Іл. 2. Троіцкі сабор Маркава манастыра ў Віцебску*

не, прымацаваным на гладка абчасаныя брусы. Увесь жывапісна-дэкаратыўны цыкл налічваў 158 кампазіцый на біблейскія, евангельскія і апакрыфічныя сюжэты і 10 выяў святых, размешчаных па баках кліраса. Кожны сюжэт быў акантаваны прамавугольнай маляванай рамай з раслінным арнаментам і меў надпіс на стараславянскай мове. П. Красавіцкі ў 1911 г. адзначаў, што «гадоў 15 назад сценапіс разглядаўся вядомым мастаком І. Я. Рэпіным. Ён вызначыў гэты сценапіс як працу таленавітага самавукі, які надаў шмат жыцця і руху фігурам»[11]. Роспісы – творы рук мясцовых майстроў Паўла Ігнатовіча і прыгоннага Івана, імёны якіх вядомы з архіўных крыніц. У стылі роспісаў адчувальны значны ўплыў барока, асабліва ў дынаміцы і складанасці шматфігурных кампазіцый, прасторавай будове архітэктурных куліс. Інтэр’ер упрыгожваў старажытны пяціярусны разьбяны іканастас, афарбаваны пад золата, а месцамі вызалачаны.

Звонку сцены сабора былі вертыкальна ашаляваны дошкамі з нашчыльнікамі і напалову вышыні закрыты абхадной галерэяй з разьбянымі слупкамі і гарызантальным дашчаным парапетам, накрытай шырокім шматсхільным гонтавым дахам, якая апярэзвала увесь будынак. У Троіцкім саборы паліганальны абрыс абхадной галерэі не адпавядаў цалкам абрысу зрубаў: быў адвольны ў алтарнай частцы, чым больш нагадваў гульбішчы рускіх храмаў. Уваходы ў сабор былі аформлены ганкамі з шатровымі дахамі і крыжамі на штыберах. Багаты дэкор дзвярэй Троіцкага сабора з вензелем фундатара С.-К. Агінскага (характэрны элемент культуры сарматызма) вылучаўся ў параўнанні з больш сціплымі ўваходамі іншых храмаў, дзе выкарыстоўвалася традыцыйнае спалучэнне геаметрычнай шалёўкі і акоўкі жалезам з цвікамі-разеткамі. Галоўны ўваход быў вырашаны накшталт царскай брамы іканастаса, упрыгожаны разьбою і паліхромным жывапісам з выявамі Св. Тройцы і евангелістаў.

З розных графічных і пісьмовых крыніц вядома, што ў XVIII ст. у рэгіёне Верхняга Падзвіння і Падняпроўя да тыпу чатырохзрубавых крыжова-цэнтрычных храмаў належалі: у Віцебску – Ільінская, Іаана Багаслова, Троіцкая на Пескавацiку і разгледжаныя вышэй Спаса-Праабражэнская і Троіцкая Маркава манастыра, манастырскія саборы пад Оршай і Мсціславам, Мікалаеўскія цэрквы ў мястэчках Бешанковічы і Дуброўна, а таксама сабор Богаяўленскага манастыра ў Смаленску. Царква ў Дуброўна адлюстравана на гравюрах мястэчка, зробленых вя-

домым рускім мастаком М.Івановым у 1784 г. Драўлянай крыжовай царкве ў Задзвінскай Слабадзе ў Бешанковічах прысвечана асобная праца М. Нікіфароўскага і Д. Даўгялы[12]. Драўляны Богаяўленскі сабор у Смаленску, пабудаваны ў 1708–1712 гг., адлюстраваны на абразы «Аўраамій і Мяркурый Смаленскія» 1723–1728 гг., якая знаходзіцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі ў Мінску. Мікалаеўскую царкву ў Дуброўне і Богаяўленскі сабор у Смаленску, пабудаваныя ў пачатку XVIII ст., зблiжае іншы, параўнальна з папярэднімі, характар перакрыцця прасторы сяродкрыжжа, якое вырашана ў выглядзе 2-яруснага купала-«бані» складанага абрысу на масіўным барабане, што падкрэслівае цэнтрычнасць кампазіцыі. У мудрагелістых формах вянчаючых мас відавочна далейшае развіццё пластычных характарыстык архітэктуры драўляных храмаў пад уплывам эстэтычнай канцэпцыі барока. Богаяўленскі сабор у Смаленску меў двух’ярусную абхадную галерэю. Двух’ярусную галерэю-«підсябітку» мае таксама царква св. Юра ў Драгобычы (1600 г.). Гэтыя прыклады акрэсліваюць храналагічныя і геаграфічныя межы дадзенага архітэктурна-будаўнічага прыёма.

У наш час ніводзін з разгледжаных храмаў ужо не існуе. Перажыўшы два цяжкія стагоддзі ганенняў на праваслаўных беларусаў, маўклівыя драўляныя сведкі вострай рэлігійнай, палітычнай і ідэалагічнай барацьбы ў Беларусі XVII–XVIII стст. чамусьці «раптам» амаль усе згарэлі ў канцы XIX ст., пры Расійскай імперыі, ці былі разабраны «за ветхостью», каб саступіць месца «истинно» праваслаўным псеўдарускім храмам. Тыя ж, што ацалелі, былі канчаткова зруйнаваны ў 1920–1930 гг.

[1] Сапунов А. П. Чертеж места Витебска 1664 г. // Труды Витебской Архивной Комиссии. – Витебск, 1910. – С. 11–24.

[2] Краснянскі В. «Чарцёж» места Віцебску 1664 г. як дакументальны помнік да гісторыі беларускага драўлянага будаўніцва // Запіскі аддзела гуманітарных навук Інбелкульта. – Кн. 1. – Т.1. – Сш. 1. – Менск, 1928. – С. 39-93.

[3] Там жа. – С. 67-68.

[4] Цэнтральны дзяржаўны архіў старажытных актаў, г.Масква. – Ф. 192. – Воп 1. – Спр. 2.

[5] Сементовский А.